УДК 37.013.46

**М.С. КАВАЛЕВІЧ**

# ПРАФЕСІЙНАЕ САМАВЫЗНАЧЭННЕ СТАРШАКЛАСНІКАЎ У КАНТЭКСЦЕ СІНЕРГЕТЫЧНАЙ ТЭОРЫІ САМААРГАНІЗАЦЫІ

*У артыкуле даследуюцца заканамернасці і законы арганізацыі прафесійнага самавызначэння сучасных старшакласнікаў. Арганізацыя прадстаўлена як дынамічны працэс па ўпарадкаванні дзеянняў аптанта, скіраваных на ажыццяўленне свядомага і самастойнага выбару.*

*У якасці прыярытэтных выступаюць заканамернасці залежнасці эфектыўнасці арганізацыі прафесійнага самавызначэння ад яго адпаведнасці ўнутраным тэндэнцыям развіцця сістэмы і своечасовасці прымянення; залежнасці тэхналогіі арганізацыі прафесійнага самавызначэння ад фазнасці руху сістэмы ў працэсе яе станаўлення і развіцця, а таксама законы сінергіі, найменшых, самазберажэння, інфарматыўнасці-ўпарадкаванасці, адзінства аналізу і сінтэзу, антагенезу, узаемадзеяння арганізацыі і самаарганізацыі, кампазіцыі і прапарцыянальнасці, адзінства асобаснага развіцця і функцыянавання чалавека як суб'екта працы.*

## Уводзіны

Паводле заснавальніка арганізацыйнай навукі А.А. Багданава, усялякая чалавечая дзейнасць аб'ектыўна з'яўляецца арганізаванай або дэзарганізаванай [1, с. 736]. А гэта абазначае, што любую чалавечую дзейнасць можна даследаваць з арганізацыйнага пункту гледжання. У самым агульным выглядзе пад арганізацыяй разумеюць упарадкаваны стан элементаў цэлага і працэс па іх упарадкаванні ў мэтазгоднае адзінства [1, с. 312]. Арганізацыю можна даследаваць у статычным і дынамічным станах.

Сучасная навука адносіць усе вядомыя сістэмы – ад самых малых (элементарныя часцінкі) да самых вялікіх – да складаных, адкрытых сістэм. Яны абменьваюцца рэчывам, энергіяй і інфармацыяй з навакольным асяроддзем і знаходзяцца, як правіла, у стане, далёкім ад раўнавагі. Іх развіццё адбываецца шляхам павелічэння ўпарадкаванасці. Самаарганізацыя, паводле Г. Хакена, –

Могилевский государственный университет имени А. Кулешова

гэта спантаннае ўтварэнне высокаўпарадкаваных структур з зародкаў або нават з хаосу [2].

З завяршэннем антрапагенезу чалавек зберагае сваю біялагічную прыроду і разам з тым пераўтвараецца ў грамадскую, сацыяльную істоту. Чалавечая дзейнасць уключае не толькі прыродныя, але і штучныя, "звышпрыродныя", сацыяльныя і культурныя фактары. Забеспячэнне ўзгодненасці гэтых фактараў можа быць здзейснена толькі розумам і воляю чалавека, г.зн. пры адпаведнай арганізацыі павінны ўзнікнуць структуры, здольныя забяспечыць мэтаскіраванае развіццё асобы ў грамадска карысным кірунку. Біялагічнае развіццё чалавека не свабодна ад сацыяльных абмежаванняў, а самаарганізацыя ў сацыяльных сістэмах спалучаецца са знешняй арганізацыяй. "Паняцце арганізацыі як альтэрнатывы самаарганізацыі звязана з упарадкаванай гуманнай дзейнасцю чалавека, яго свядомасцю і воляю" [1, с. 348].

У нашым даследаванні арганізацыя прадстаўлена як дынамічны працэс па ўпарадкаванні дзеянняў аптанта (чалавек у сітуацыі выбару), скіраваных на ажыццяўленне свядомага і самастойнага выбару.

## Заканамернасці арганізацыі прафесійнага самавызначэння

Даследаваннем устаноўлены наступныя заканамернасці арганізацыі працэсу прафесійнага выбару.

1. Эфектыўнасць арганізацыі прафесійнага самавызначэння залежыць не столькі ад сілы і велічыні педагагічнага ўздзеяння, колькі ад яго адпаведнасці ўнутраным тэндэнцыям развіцця сістэмы і своечасовасці прымянення, нават самыя нязначныя педагагічныя ўздзеянні могуць аказацца вырашальнымі для прафесійнага і жыццёвага лёсу асобы старшакласніка.

2. Эфектыўнасць педагагічнай падтрымкі залежыць ад узгодненасці, сінхранізацыі дзеянняў абодвух бакоў, сінергетызму педагагічнага ўзаемадзеяння. Чым шырэйшы агульны спектр педагагічнага ўздзеяння і ўнутраных тэндэнцый развіцця сістэмы, тым мацнейшы іх сінергетычны эфект, які заключаецца ў стварэнні ўмоў для развіцця асобы, свабоды выбару шляхоў развіцця. Крыніцай і рухальнай сілай развіцця і самавызначэння асобы з'яўляецца яе ўласны сінергетызм і сінергетызм узаемадзеяння з педагогам, якія ўтвараюць сінергетычную сістэму.

3. Тэхналогія педагагічнай падрымкі залежыць ад фазнасці руху сістэмы ў працэсе яе станаўлення і развіцця. Адна справа, калі сістэма знаходзіцца ў фазе станаўлення парадку (сінергетычная фаза), другая – калі сістэма знаходзіцца ў фазе захавання парадку (кібернетычная фаза). Для тэндэнцыі *нараджэння парадку* ў сістэме прафесійнага самавызначэння характэрны: узрастанне няўпэўненасці аптанта ў правільнасці зробленага выбару і абраных шляхоў яго ажыццяўлення; няўстойлівасць асобаснай пазіцыі, ініцыятыва, нарастанне дынамікі працэсу прафесійнага выбару; каштоўнасць асобаснай самарэалізацыі; павелічэнне ролі выпадковых фактараў, магчымасць выпадковага выбару. Фаза *захавання парадку* забяспечвае ўстойлівае функцыянаванне сістэмы прафесійнага выбару. Для яго характэрны: абмежаванне знешніх кантактаў; арыентацыя на традыцыйныя каштоўнасці; стабільнасць і ўпэўненасць у правільнасці зробленага выбару [3].

## Законы арганізацыі прафесійнага самавызначэння

Важнай умовай эфектыўнай арганізацыі працэсаў прафесійнага выбару з'яўляюцца веды пра законы арганізацыі складаных сістэм. Згодна з агульнай тэорыяй арганізацыі да агульных законаў арганізацыі адносяцца законы сінергіі,

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

найменшых, самазберажэння, упарадкаванасці, адзінства аналізу і сінтэзу, развіцця (антагенезу), кампазіцыі і прапарцыянальнасці, закон узаемадзеяння арганізацыі і самаарганізацыі [1, с. 353]. Улічыўшы спецыфіку прадмета даследавання, намі дадаткова сфармуляваны закон адзінства асобаснага развіцця і функцыянавання чалавека як суб'екта працы, што выконваецца ў межах жыццёвай стратэгіі. Паспрабуем прымяніць гэтыя агульныя законы да інтэрпрэтацыі працэсу арганізацыі прафесійнага самавызначэння старшакласнікаў.

*Агульны закон развіцця і прафесійнага самавызначэння асобы* старшакласніка як самаарганізаванай сістэмы мы сфармулявалі наступным чынам: прафесійны выбар, станаўленне новага шляху развіцця адбываецца ва ўмовах адкрытасці, знаходжання ў крытычным або біфуркацыйным стане, які характарызуецца няўстойлівасцю, неўраўнаважанасцю, нелінейнасцю. Выпадковасці і адхіленні могуць вырашальным чынам паўплываць на ўзнікненне новага шляху развіцця асобы, а хаос можа выконваць канструктыўную функцыю ў творчым працэсе прафесійнага самавызначэння старшакласніка.

Тэорыя самаарганізацыі ў якасці асноўнага закону абгрунтавала *закон сінергіі,* які адлюстроўвае сувязь паміж арганізаванасцю і сінергетычным эфектам. Сутнасць закону сінергіі заключаецца ў тым, што сума ўласцівасцей арганізаванага цэлага перавышае "арыфметычную" суму якасцей кожнага элемента, што ўваходзіць у склад цэлага, і тым больш перавышае, чым больш гэтыя часткі арганізаваны ў адзінае цэлае.

Сінергетычны эфект, які быў дасягнуты ў працэсе эксперыментальнага даследавання за кошт распрацоўкі і прымянення нелінейнай тэхналогіі арганізацыі прафесійнага самавызначэння, праявіўся ў тым, што адбыліся істотныя змены ў інфармацыйным полі старшакласнікаў, іх самавызначэнне ажыццяўлялася на аснове ўсведамлення каштоўнасці самавызначэння, асобаснага сэнсу будучай спецыяльнасці і шляхоў яе атрымання, асэнсавання ўласных асобасных якасцей. Дастаткова істотныя змены адбыліся ў энергетычным полі асобы: вучні паверылі ў свае магчымасці, навучыліся супастаўляць асобасныя якасці з патрабаваннямі прафесіі, узрасла іх цікавасць да будучай прафесіі. Адзначаны станоўчы ўплыў на развіццё рэсурснай асновы асобы: зафіксавана ўсведамленне неабходнасці планавання ўласнай будучыні, уменне складаць прафесійныя планы і знаходзіць сродкі для іх ажыццяўлення, ставіць задачы па асобасным і прафесійным удасканаленні, шукаць і знаходзіць сэнс жыцця, у якім прафесійная дзейнасць займае годнае месца. Сінергетычны эфект быў дасягнуты за кошт узгодненага выкарыстання элементаў адаптыўнай тэхналогіі, ідэй асобасна-арыентаванага навучання, тэхналогіі майстэрняў, тэхналогіі самаразвіцця і самавызначэння, ідэй вальдорфскай педагогікі, дыялогавага падыходу, модульнага і праектнага навучання, коўчынгавых і каўнселінгавых тэхналогій.

*Закон найменшых* выяўляецца ў тым, што структурная ўстойлівасць цэлага вызначаецца найменшай яго частковай устойлівасцю. Устойлівасць прафесійнага выбару вызначаецца моцнасцю самага слабога яго кампанента. Практыка прафесійнага кансультавання сведчыць аб тым, што лагічны ланцужок перакананняў кансультанта разбураецца, калі хаця б адно з яго звёнаў не вытрымлівае доказаў аптанта, падвяргаецца ім сумненню. Гэтым жа законам тлумачыцца неабходнасць выбраць прафесію з улікам стану здароўя, які пры яго неадпаведнасці і вызначае ступень прафесійнай прыдатнасці (непрыдатнасці) нават пры вялікім імкненні, наяўнасці неабходных ведаў для атрымання жаданай прафесіі. Пры гэтым найбольш слабы кампанент можна ўзмацніць з кошт рэсурсаў іншых кампанентаў, чым значна павялічваецца эфектыўнасць прафесійнага выбару. Здароўе можна зберагчы і нават палепшыць, калі выбраць

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

такі від прафесійнай дзейнасці, які будзе садзейнічаць гэтаму. Іменна закон найменшых вызначае жыццёвую стратэгію і тактыку, поспехі і дасягненні ў розных сферах дзейнасці.

*Закон самазберажэння* сцвярджае, што любая рэальная фізічная (арганізаваная) сістэма імкнецца зберагчы сябе. Зберагчы сябе сістэма можа толькі шляхам станоўчага або адмоўнага адбору. *Станоўчы адбор* павялічвае разнастайнасць формаў, *адмоўны адбор* знішчае няўстойлівасці і выпадковасці, павялічвае ўпарадкаванасць і ўзгодненасць у сістэме. Выжыць прафесіяналу ў сучасным зменлівым свеце можна толькі шляхам самазберажэння свайго высокага ўзроўню прафесіяналізму і прывядзення яго ў адпаведнасць з новымі патрабаваннямі, якія пастаянна павышаюцца. Такі від устойлівасці называюць дынамічнай устойлівасцю.

Пра закон самазберажэння трэба памятаць, рэкамендаваўшы аптанту тую ці іншую вобласць прафесійнай дзейнасці ў якасці яго жыццёвай перспектывы або абмеркаваўшы прапановы аптанта аб магчымых прафесійных выбарах. Адаптыўныя магчымасці арганізма не бязмежныя, а неадпаведнасць асобасных якасцей або стану здароўя можа быць такой, што іх кампенсацыя ў арганізме ўвогуле не запраграмавана. Арганізм можа ажыццявіць такую кампенсацыю толькі да пэўных межаў. Калі адхіленні ў стане здороўя або ў развіцці асобасных якасцей выходзяць за межы, у якіх сістэма з дадзенай структурай устойліва функцыянуе, прафесіянал яшчэ спраўляецца са сваімі абавязкамі. Пры больш інтэнсіўных адхіленнях адбываюцца структурныя змены ў стане псіхічнага або фізічнага здароўя чалавека, якія ўяўляюць небяспеку для самога існавання сістэмы, жыцця чалавека ў дадзеным выпадку. Задача педагагічнай падтрымкі аптанта ў яго прафесійным выбары заключаецца ў павышэнні яго дынамічнай устойлівасці, яго жыццяздольнасці ў зменлівым свеце прафесій і прафесіяналаў. А для гэтага трэба развіваць кампенсатарныя і адаптыўныя магчымасці будучых прафесіяналаў.

Закон *інфарматыўнасці-ўпарадкаванасці* сцвярджае, што ў сістэме не можа быць больш парадку, чым інфармацыі. Упарадкаванасць разглядаецца як пэўным чынам устаноўленыя ўзаемасувязі паміж элементамі сістэмы. Вядомы і механізм дзеяння закону інфарматыўнасці-ўпарадкаванасці: унутраная арганізаванасць цэлага прадвызначана магчымасцямі пераадолення інфармацыйнай нявызначанасці ў сістэме.

Паколькі сістэма прафесійнага самавызначэння з'яўляецца адкрытай складанай сістэмай, якая актыўна ўзаемадзейнічае з навакольным асяроддзем, то для яе нармальнага функцыянавання неабходна аптымальнае забеспячэнне як прафесіяграфічнай, так і псіхалагічнай інфармацыяй [4, с. 22-25]. Гэта будзе садзейнічаць змяншэнню нявызначанасці зместу і шляхоў прафесійнага выбару, асобасных якасцей, неабходных для ажыццяўлення аптымальнага выбару. Упарадкаванасць сістэмы ўзрастае па меры змяншэння нявызначанасці шляхоў яе развіцця і змяншаецца, прыбліжае сістэму да хаосу па меры павелічэння нявызначанасці шляхоў развіцця або інфармацыі сістэмы.

*Закон адзінства аналізу і сінтэзу* заключаецца ў тым, што працэсы раздзялення, спецыялізацыі, дыферэнцыяцыі дапаўняюцца супрацьлеглымі працэсамі – злучэння, кааперацыі, інтэграцыі. Галоўная ідэя закону заключаецца ў тым, што сістэма ёсць цэлае, якое нельга падзяліць на незалежныя часткі. Калі яны падзелены, сістэма губляе свае істотныя якасці. Сістэма ў цэлым можа мець такія якасці, якія не характэрны ні для адной з яе падсістэм.

У сувязі з дадзеным законам на першым этапе даследавання мы ажыццявілі ідэнтыфікацыю педагагічнай сістэмы ПСВ з сінергетычнымі аб'ектамі і абгрунта-

Могилевский государственный университет имени А. А. Кулешова

валі магчымасць пераносу заканамернасцей развіцця прыродных аб'ектаў на сацыяльныя сістэмы. Задача, якую трэба было вырашыць, заключалася ў ідэнтыфікацыі канкрэтных задач арганізацыі прафесійнага самавызначэння са стэрэатыпнымі сінергетычнымі мадэлямі. На другім этапе неабходна было ахарактарызаваць якасці і паводзіны дысіпатыўных сістэм, да якіх мы аднеслі сістэму арганізацыі прафесійнага самавызначэння. На трэцім этапе была зроблена спроба інтэрпрэтаваць працэсы прафесійнага выбару з сінергетычнага пункту гледжання. Спалучэнне аналізу і сінтэзу дазволіла раскрыць структуру працэсу прафесійнага самавызначэння і растлумачыць, як у ім узаемадзейнічаюць унутраныя і знешнія фактары. А гэта, у сваю чаргу, садзейнічала гарманічнаму спалучэнню натуральнай і штучнай падсістэм прафесійнага самавызначэння і атрыманню сінергетычнага эфекту.

*Закон антагенезу* прадвызначае, што кожная арганізацыя праходзіць у сваім развіцці наступныя фазы жыццёвага цыклу: станаўленне, росквіт, спад.

Чым больш мэтазгодна арганізаваны працэс педагагічнай падтрымкі аптанта ў сітуацыі прафесійнага выбару, тым больш эфектыўным будзе яго прафесійнае самавызначэнне, тым больш адаптыўных і кампенсатарных магчымасцей у будучага прафесіянала. Разумная арганізацыя прафесійнага самавызначэння садзейнічае развіццю прафесійнай самасвядомасці, фарміраванню веры ў максімальныя магчымасці самарэалізацыі ў прафесійнай дзейнасці, актывізацыі прафесійнага самавызначэння, павышэнню яго ўзроўню, пераходу ў рэжым самаарганізацыі.

*Закон кампазіцыі і прапарцыянальнасці* адлюстроўвае неабходнасць узгаднення мэтаў арганізацыі ПСВ: яны павінны быць скіраваны на падтрымку асноўнай мэты жыцця. Прыходзіцца ўзгадняць унутраныя мэты развіцця асобы аптанта і мэты грамадства, мэты бацькоў, класнага кіраўніка, настаўнікаў-прадметнікаў і школьнага псіхолага. Прычым мэты аптанта трэба іерархічна пабудаваць, а для гэтага мэты больш нізкага ўзроўню мэтазгодна падпарадкаваць мэтам больш высокага ўзроўню, вызначыць агульную мэту жыцця, месца прафесійнай дзейнасці ў дасягненні гэтай мэты, задачы, якія трэба вырашаць штодзённа, скіраваць на дасягненне пастаўленай мэты.

*Закон узаемадзеяння арганізацыі і самаарганізацыі.* Працэс прафесійнага самавызначэння – гэта ўзаемадзеянне і суадносіны арганізацыйных і самаарганізацыйных механізмаў. Неабходнасць пераходу ад рэпрадуктыўнага спосабу засваення матэрыялу (арганізаванага педагогам-прафкансультантам, заснаванага пераважна на запамінанні і ўзнаўленні вучэбнага матэрыялу і прафесіяграфічных звестак) да "прысваення" яго за кошт рэфлексіі на якасна новым узроўні (сувязь арганізацыі і самаарганізацыі мыслення – "інфаэнергетыка") цяпер з навуковых пазіцый тлумачыцца праз механізм узаемадзеяння арганізацыйных і самаарганізацыйных працэсаў.

*Закон адзінства асобаснага развіцця і функцыянавання чалавека як суб'екта працы, што выконваецца ў межах жыццёвай стратэгіі.* Сутнасць закону заключаецца ў тым, што асобаснае і прафесійнае развіццё непадзельныя. Прынцып самаразвіцця вызначае поспех асобаснага і прафесійнага станаўлення, творчай самарэалізацыі. Дынаміка псіхалагічнай гатоўнасці да прафесійнага самавызначэння ўзгадняецца з логікай асобаснага развіцця. Выбар прафесіі і авалоданне ёю радыкальна мяняюць сацыяльную сітуацыю развіцця асобы, уплываюць на развіццё яе здольнасцей, матывацыйна-патрэбаснай сферы, інтарэсаў, каштоўнасных арыентацый. Рэалізацыя ідэі цэласнасці і адзінства асобаснага і прафесійнага развіцця патрабуе стварэння ўмоў для гарманічнага развіцця асобы на этапе прафесійнага самавызначэння. Асобасныя характарыстыкі (устаноўкі, патрэбы, інтарэсы, узровень дамаганняў) значна ўплываюць на паспяхо-

Могилевский государственный университет имени А. А. Кулешова

Могилевский государственный университет имени А. А. Кулешова

васць прафесійнага самавызначэння. Яны могуць як садзейнічаць паспяховаму прафесійнаму самавызначэнню, так і запавольваць яго. Сталасць асобы з'яўляецца перадумовай таго, каб чалавек здзейсніўся як прафесіянал. Такім чынам, ступень актыўнасці чалавека ў пабудове ўласнай прафесійнай траекторыі вызначаецца маральнай спеласцю асобы, уменнем ставіць перад сабой мэты, якія дазваляюць яму выходзіць за межы сваіх наяўных магчымасцей.

## Заключэнне

Праведзенае даследаванне паказала магчымасць эфектыўнага выкарыстання заканамернасцей і законаў арганізацыі ў мэтах педагагічнай падтрымкі прафесійнага самавызначэння старшакласнікаў. У якасці прыярытэтных выступаюць наступныя заканамернасці: залежнасць эфектыўнасці арганізацыі прафесійнага самавызначэння ад яго адпаведнасці ўнутраным тэндэнцыям развіцця сістэмы і своечасовасці прымянення; залежнасць тэхналогіі арганізацыі прафесійнага самавызначэння ад фазнасці руху сістэмы ў працэсе яе станаўлення і развіцця, а таксама законы арганізацыі: сінергіі, найменшых, самазберажэння, інфарматыўнасці-ўпарадкаванасці, адзінства аналізу і сінтэзу, антагенезу, узаемадзеяння арганізацыі і самаарганізацыі, кампазіцыі і прапарцыянальнасці, адзінства асобаснага развіцця і функцыянавання чалавека як суб'екта працы, што выконваецца ў межах жыццёвай стратэгіі. Задача педагога заключаецца ў тым, каб стварыць найбольш аптымальныя ўмовы для выкарыстання сфармуляваных заканамернасцей і законаў у практычнай дзейнасці.

### *ЛІТАРАТУРА*


1. Теории организации. Антология / сост. В.Л. Семикова. – М.: Академ. проект: Гаудеамус, 2005. –"Gaudeamus" – 960 с.
2. ***Хакен, Г.*** Синергетика / Г. Хакен. – М.: Мир, 1980. – 404 с.
3. ***Кавалевіч, М.С.*** Канцэптуальныя асновы арганізацыі прафесійнага самавызначэння старшакласнікаў ва ўмовах профільнага навучання / М.С. Кавалевіч // Веснік Брэсцк. ун-та. Сер. гуманітар. і грамад. навук. – 2006. – № 3. – С. 77-84.
4. ***Кисилева, Н.Г.*** Психолого-педагогическая поддержка профессионального самоопределения старшеклассников / Н.Г. Кисилева // Адукацыя і выхаванне. – 2008. – № 7. – С. 22-25.


Паступіў у рэдакцыю 22.01.2009 г.